# ЛАБАРАТОРЫЯ СВЯТЛА

## У Нацыянальнай бібліятэцы працуе святочная выстаўка



Карціны, якія выпраменьваюць святло! У час, калі ўвесь свет захоплівае святочная атмасфера, у Нацыянальнай бібліятэцы заззялі «Калядныя званы». Гэта назва незвычайнай выстаўкі. Карціны ў літаральным сэнсе свецяцца знутры. Новы кірунак сучаснага жывапісу і мае адпаведную назву — святлізм. Падобныя элементы можна знайсці ў знакамітых мастакоў Шагала і Малевіча. Заснавальнікам святлізму ў сучасным беларускім мастацтве лічаць Рыгора Іванова. Майстар кажа, што, каб сагрэць думкі, яму патрэбны толькі алейныя фарбы.

Святлізм — калі сама карціна і ўсё ў ёй выпраменьвае святло, гэта адчуванне, працэс, пры якім чалавек у сабе адкрывае пачуццё святла, сам робіцца святлом.

На першы погляд работы жывапісца могуць здацца простымі і немудрагелістымі, але на самай справе іх стварэнне патрабуе шмат працы і яшчэ больш шчырасці. Яны ўносяць у наша жыццё тое, чаго так не хапае, — цяпло, пяшчоту і радасць, цуд і гармонію. У работах аўтара амаль фізічна адчуваецца пульсацыя колераў.

— Святло для мяне — сімвал Бога. Я звязваю святлізм з верай. Мне часам здаецца: глядзіш на твор, і ён як лекі, прыняў — і дапамагае ад смутку, журбы, цемры. Святло ўсіх аб'ядноўвае, — расказвае Рыгор Іваноў. — У кожным маім творы закладзена стыхія. У мяне калісьці была выстаўка «Водары колеру», гледзячы на карціны якой здавалася, што адчуваеш водар кожнай работы. Гэта ўсё асацыяцыі. Так і ў дадзеным выпадку: чалавек, гледзячы на святло, знаходзіць у ім сваё чараўніцтва, якое, напрыклад, не ўбачу я. У маіх работах ёсць свабода. Няма прывязкі да канкрэтнага сюжэта, ёсць фантазія і ўяўленне. «Калядныя званы» — таксама ўнутранае свята, якім хачу падзяліцца з іншымі.

Мастак працаваў у розных напрамках, але ж абстракцыя стала для яго найбольш блізкай. Аўтар падкрэслівае, што яна лепш развівае ўяўленне.

Свае работы Рыгор Іваноў падзяляе на тры ўзроўні. Першы — паверхня рэальнасці. У творах прысутнічаюць людзі, можна ўбачыць размежаванне колераў, выразныя грані, якія пастунова знікаюць, а карціны выпраменьваюць святло. Другі ўзровень — у іх бачны знак маланкі. Прачытваецца сілуэт. Вобраз маланкі мы пераносім на сябе ў цэнтр святла — сонечнае сплячэнне. Адразу адчуваецца энергія, сіла. Трэці ўзровень для аўтара — вяршыня, адчуванне, што дасягнуты абсалют. Тут прысутнічае пульсацыя і вібрацыя за кошт святла, і чалавек нібы трапляе ў метафізічную прастору.

— Кожны з гэтых узроўняў выцякаў адзін з аднаго. Увесь працэс заключаецца ў тым, што я як мастак стаў адыходзіць ад матэрыяльнага, абстрагавацца ад навакольных фактараў. У маіх работах паступова стала заставацца толькі святло, — тлумачыць мастак. — Фарміраваць кірунак святлізму я пачаў у 2015 годзе. Да гэтага часу была больш фігуратыўная рэальнасць, але пошук у абстракцыі я не кідаў. Свой шлях творчасці я часам параўноўваю з лабараторыяй. Таму што гэта пасапраўднаму навукова-даследчая праца.

У архіве мастака ўжо больш чым паўтысячы работ. Карціны Рыгора Іванова, акрамя Беларусі, знаходзяцца ў музеях Швейцарыі і ЗША, а таксама ў прыватных калекцыях па ўсім свеце. Выстаўка ў Нацыянальнай бібліятэцы працуе да 1 лютага.

**Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара**